# Вялікі вучоны з малой вёскі Янаўка

**20 ліпеня споўнілася б 100 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Васільевіча Анічэнкі, доктара філалагічных навук, прафесара.**
**Уладзімір Васільевіч Анічэнка нарадзіўся у в. Янаўка Хоцімскага раёна. Сям'я была шматдзетнай: маці нарадзіла 11 дзяцей. Уладзімір Васільевіч быў пятым. Бацькі будучага прафесара, Васіль Макаравіч і Вольга Піліпаўна, былі непісьменнымі людзьмі, з сялян-беднякоў.**


У. В. Анічэнка

Дзіцячыя гады Уладзіміра прайшлі ў роднай вёсцы. Жыць было нялёгка, часам даводзілася галадаваць. Ужо з маленства сын усяляк імкнуўся дапамагчы сям'і. Жылі бедна, але ўмелі радавацца жыццю. Усе добра спявалі. У сям'і Анічэнка сярод першых у вёсцы з'явіліся балалайка і гармонік. Уладзімір нотнай граматы не ведаў, але няблага іграў на слых. Аднавяскоўцы і жыхары іншых вёсак часта запрашалі яго ў якасці музыканта на свята ці на гулянку.

Філалагічныя здольнасці Уладзіміра праявіліся даволі рана. Яшчэ ласць. Вярнуўшыся дадому, апынуўся на акупаванай тэрыторыі, дзе пражываў да 1942 года. Сёлета быў сагнаны на працу ў Нямеччыну. На катаржных працах знаходзіўся спачатку ў Польшчы, затым у Аўстрыі і Чэхаславакіі. У Чэхіі ўдалося здзейсніць уцёкі ў Арліцкія горы і звязацца з партызанамі. У 1943-1945 гады Уладзімір Васільевіч быў разведчыкам чэшскага партызанскага атрада «Эда». Пасля злучэння з часцямі Савецкай Арміі, у 1945-1946 гадах, служыў у яе шэрагах. Ратны шлях У. В. Анічэнкі адзначаны ордэнам «Cescoslovensky Partyzan», меда-


Пасол Чэхаславакіі ўручае У. В. Анічэнка медаль «Чэхаславацкі партызан»

1 кастрычніка 1946 г. У 1947 г. па рэкамендацыі Старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхася Лынькова займаў пасаду літаратурнага супрацоўніка ў рэдакцыі газеты «Зара» Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці. Пакаштаваўшы журналісцкага хлеба, ён адчуў сапраўдную асалоду ад беларускага слова і вырашыў стаць лінгвістам.

У жніўні 1947 г. Уладзімір Васільевіч быў залічаны на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Падчас вучобы быў выдатнікам, старастам курса і ўзначальваў студэнцкі дыялекталагічны гурток, у якім займаўся вывучэннем беларускіх народных гаворак. У 1952 г. з адзнакай скончыў універсітэт, у 1955 г. – аспірантуру Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук БССР і застаўся там у якасці малодшага навуковага супрацоўніка.

У 1956 г. атрымаў ступень кандыдата філалагічных навук, у 1958 г. – пасаду старшага навуковага супрацоўніка, у 1970 г. яму была прысуджана ступень доктара філалагічных навук. У 1970-2001 гг. працягваў працоўную дзейнасць у Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны.

Вялікае месца ў навуковай дзейнасці У. В. Анічэнкі займала вывучэнне творчай спадчыны Францыска Скарыны. Трохтомны «Слоўнік мовы Скарыны», выдадзены У. В. Анічэнкам, прынёс яму вядомасць далёка за межамі Беларусі. Асобае месца ў дзейнасці Уладзіміра Васільевіча за-

славістаў у Балгарыі, прадстаўляў беларускую навуку на міжнародных канферэнцыях і нарадах.

За вялікі ўклад у развіццё «скарыніяны» Уладзімір Васільевіч быў уганараваны царкоўнай узнагародай «Крыж Сергія Раданежскага». Кандыдаты навук, падрыхтаваныя У. В. Анічэнкам, працуюць у розных ВНУ нашай краіны і за яе межамі. За плённую навуковую і грамадскую дзейнасць У. В. Анічэнка быў узнагароджаны медалём «За працоўную доблесць», медалём Францыска

роднага ўзроўню, ён быў адным з пачынальнікаў «скарыніяны» і ініцыятараў прысваення Гомельскаму дзяржаўнаму універсітэту ганаровага імя беларускага першадрукара.

Уладзімір Васільевіч прыклаў шмат намаганняў дзеля таго, каб беларускае слова гучала на нашай зямлі і яго навучыліся шанаваць з маленства.

У. В. Анічэнка – гэта чалавек-эпоха чалавек-жывая гісторыя, асоба, жыццё якой напоўнена падзеямі як трагічнымі, змрочнымі, так і

ў чацвёртым класе пачатковай Камуна-Сельскай школы за каліграфічны почырк, выдатныя поспехі і прыкладныя паводзіны ён атрымаў пахвальную грамату. Наступным этапам вучобы была Хоцімская сярэдняя школа, у якой ён вучыўся на працягу 1935-1941 гг.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны дапамагаў калгасу эвакуіраваць грамадскае быдла ў Курскую воб-

лямі «Slovacke Naradni Povstoni», «Cestny Odznak svazu Protifasistickych Bojovniku», «Партызану Айчыннай вайны» 2-й ступені, «За перамогу над Германіяй».

У дзяцінстве Уладзімір Васільевіч марыў стаць матэматыкам. Аднак лёс распарадзіўся інакш. Пасля вайны ён служыў у Савецкай арміі ў армейскім друку, адкуль па стане здароўя быў дэмабілізаваны

няла падрыхтоўка «Слоўніка мовы Янкі Купалы».

У. В. Анічэнка з'яўляўся галоўным рэдактарам міжведамаснага зборніка «Беларуская мова», членам гуманітарнай секцыі Фонду фундаментальных даследаванняў Беларусі, членам савета па прысуджэнні вучонай ступені доктара філалагічных навук пры БДУ. Ганаровы член Брытанскага таварыства беларускай мовы, дэлегат Міжнароднага з'езда

Скарыны. За паспяховую працу па падрыхтоўцы кадраў і ўклад у развіццё беларускага мовазнаўства Уладзімір Васільевіч быў удастоены звання «Заслужаны дзеяч навукі Беларускай ССР». У 1976 г. яму было прысвоена званне «Ганаровы прафесар Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны».

Універсітэцкі выкладчык і вучоны, вядомы даследчык гісторыі ўсходнеславянскіх моў, славіст міжна-

светлымі, шчаслівымі. Хацелася б, каб гісторыя яго жыцця і навуковая дзейнасць была не толькі часцінкай гісторыі нашага горада, раёна, а стала яшчэ і духоўным набыткам.

**Аксана ПРУДНІКАВА,**
**намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце сярэдняй школы № 2 г. п. Хоцімска, унучатая пляменніца У. В. Анічэнкі**

**Пруднікава, А. Вялікі вучоны з малой вёскі Янаўка** : пра Уладзіміра Васільевіча Анічэнку, доктара філалагічных навук, прафесара / Аксана Пруднікава // Шлях Кастрычніка. — 2024. — 24 ліпеня. — С. 5.